Надвор'е

# Такое вось бабіна лета

## На гэтым тыдні будзе на 4 градусы цяплей звычайнага

**Канец верасня, сонца ўжо не такое актыўнае, а ўначы без курткі не паходзіш. У гэты час пасля традыцыйнага пахаладання жыхароў нашай краіны чакае працяглы перыяд цёплага і сухога надвор'я. Яго яшчэ называюць бабіным летам, і будзе яно ў нас мінімум да суботы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Менавіта на гэтым тыдні паветраныя патокі паступова стануць змяняцца з паўночна-заходніх на паўднёвыя. На змену палярнаму холаду ў нашу краіну пачнуць паступаць порцыі паветра чарнаморскага паходжання з тэмпературай у сярэднім на 4 градусы вышэй за ўстаноўленую па клімаце апошняй дэкады верасня.

Ужо сёння будзе без дажджоў, а тэмпература паветра 20—26 цяпла. Потым прыйдзе пара дзён цудоўнага надвор'я. Два дні будзе абсалютна суха. У сераду і чацвер, 23—24 верасня, уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 градусаў да 11 цяпла, месцамі — плюс 12—13 цяпла. Удзень будзе ад плюс 20 градусаў на паўночным усходзе да 27 цяпла на паўднёвым захадзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы і раніцай у асобных раёнах па паўночным захадзе краіны магчымыя кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 градусаў на ўсходзе да 15 цяпла на паўднёвым захадзе краіны. Удзень будзе камфортна і 20—27 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У «адно акно» ўмясцілася 181

## Дарослым — дакументы, дзецям — цацкі

Замест 103 адміністрацыйных паслуг з мая 2020-га ў «адным акне» можна атрымаць 181 і вырашыць на 80 % больш пытанняў, чым раней. Гэтая служба — месца, куды грамадзянін можа прыйсці з заявай і пасля забраць неабходныя дакументы, і яму не трэба шукаць пэўнае структурнае падраздзяленне, высвятляць, якія работнікі выдадуць яму патрэбныя паперы, падладжвацца пад рэжым іх работы, сведчаць спецыялісты.

— Мэтавае ўдасканаленне работы службы, якая заклікана прымаць заявы аб ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур і выдаваць адміністрацыйныя рашэнні па іх, — важнае для людзей, — упэўнена **Наталля ФІЛІПАВА, намеснік міністра юстыцыі Беларусі.** — Таму Міністэрства юстыцыі паступова пашырае пералік працэдур, каб у «адным акне» канцэнтравалася як мага большая колькасць паслуг, затрабаваных у насельніцтва. Гэта ствараe ўмовы для аказання насельніцтву дзяржаўных паслуг максімальна даступна, зручна і з найменшымі затратамі часу і сіл пры звароце да мясцовых органаў улады.

Гэтая служба адпавядае ўсім патрабаванням заканадаўства. Тут цудоўна абсталяваны рабочыя месцы супрацоўнікаў, месца чакання, арганізавана электронная чарга і ёсць магчымасць электроннай аплаты пэўных працэдур, ахарактарызавала «адно акно» Заводскага раёна намеснік міністра:

— Цікавым рашэннем стала таксама арганізацыя тут дзіцячага пакоя. Калі наведвальнікі прыходзяць з дзеткамі, пакуль дарослыя вырашаюць пытанні, малых займае аніматар. У пакоі ёсць таксама тэлевізар, цацкі, кнігі. Створана і безбар'ернае асяроддзе. Увогуле галоўная мэта гэтай службы — арганізаваць камфорт і прыстойныя ўмовы для арганізацыі ўзаемадзеяння дзяржорганаў і грамадзян.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## Жыллё, садок, субсідыі запатрабаваны

Заводскі раён — адзін з найстарэйшых у Мінску. Тут жыве 234,5 тысячы людзей, якіх абслугоўвае дзесяць спецыялістаў службы «адно акно», двое з якіх — у аддзеле ЗАГС. 110 чалавек сюды прыходзяць штодня, а за восем месяцаў нашы спецыялісты апрацавалі больш за 23 тысячы заяў, расказаў **Аляксандр КРЫМСКІ, кіраўнік спраў адміністрацыі Заводскага раёна.**

— Пратэрміновак і скаргаў на работу нашых спецыялістаў няма. Абсталяванне сучаснае, што, вядома, дапамагае ў рабоце. Аднак перш за ўсё гэта якасныя кадры. Спецыялісты могуць і прakансультаваць грамадзян, бо ўсё роўна чалавеку нешта трэба яшчэ дадаткова спытаць і высветліць, каб лепш разумець. Калі здараецца, што чалавеку прыйшлося вярнуцца да нас, бо яму няправільна афармілі дакумент ці ў яго няпоўны камплект папер, мы стараемся запрасіць да сябе ў службу прадстаўніка структурнага падраздзялення, каб усе подпісы, пячаткі былі належным чынам аформлены адразу і не расцягвалі чалавеку тэрмін чакання дапрацовак.

Ацаніць работу спецыялістаў пры жаданні можна, паставіўшы «лайк» за абслугоўванне ў тым жа акенцы электроннай сістэмы, якая выдае талоны на чаргу. Абяцаюць у службе «з часам дайсці і да вайфая».

Найчасцей людзі звяртаюцца дзеля атрымання дакументаў у галіне жыллёвых праваадносін, сферах працы і сацыяльнай абароны, архітэктуры і будаўніцтва, адзначаюць у раённай адміністрацыі сталіцы.

Сярод запатрабаваных афіцыйных папер — прызначэнне дапамог, у тым ліку дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, сямейнага капіталу, догляду за інвалідамі. Актуальнае атрыманне дакументаў па пытаннях апекі, пастаноўкі на чаргу, накіраванняў у дзіцячы садок. Папулярная і выдача дазволаў аб адчужэнні аб'ектаў нерухомасці ці зямельных участкаў, папер для пастаноўкі на чаргу асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, узгадненняў перапланіровак і самавольных пабудоў. Існуе попыт на дакументы па ўключэнні ў склад арганізацый забудоўшчыкаў, па выдачы субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або пакупку жылля, па рэгістрацыі дагавораў найму жылога памяшкання, па ўзгадненні ўстаноўкі антэн. Часта грамадзянам неабходны таксама дазволы на ўзвядзенне дамоў, узгадненні праектнай дакументацыі, працягненні тэрмінаў будаўніцтва розных аб'ектаў.

## Больш электроннага і комплекснага

Мяркуецца, што праз некалькі гадоў у электроннай форме можна будзе атрымаць даведку аб знаходжанні на ўліку асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, аб займаемым жылым памяшканні і складзе сям'і, аб месцы жыхарства, выдачы аднаразовай субсідыі на будаўніцтва ці набыццё жылля. Таксама можна будзе атрымаць запрашэнне іншаземца ў Беларусь, даведку аб аплаце падаходнага падатку з фізічнай асобы, вярнуць лішкі выплачаных мытных плацяжоў. «Электронным» стане і шэраг працэдур у сферы дзяржрэгістрацыі зямельных надзелаў і нерухомасці.

— Звычайныя працэдуры паэтапна пераводзяцца ў электронны выгляд, і іх пералік будзе толькі павялічвацца, — дадала Наталля Філіпава.

Асобна прапрацоўваюць спецыялісты Мінюста стварэнне цэлых пакетаў паслуг для шматдзетных. Мяркуецца, што сям'я, прыйшоўшы толькі з адной заявай, зможа атрымаць адразу комплекс адміністрацыйных працэдур.

— З нараджэннем трэцяга-чацвёртага дзіцяці адразу з'яўляецца неабходнасць у шэрагу працэдур. Трэба зарэгістраваць факт з'яўлення немаўляці, зарэгістраваць яго месца жыхарства, паставіць на ўлік у дашкольную ўстанову, — прывяла прыклад прадстаўніца Мінюста. — Можна будзе адразу аформіць пасведчанне шматдзетнай сям'і (калі нарадзіўся трэці) або ўнесці ў яго змены (калі немаўля чацвёртае і далейшае). Вырашыць пытанне пастаноўкі на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, або ўнесці змены ў спісы такіх грамадзян.

Спецыялісты мяркуюць, што такі зручны інструмент для падтрымкі людзей, магчыма, з'явіцца ў краіне да канца года. А ўвогуле яны імкнуцца да таго, каб усе дзяржаўныя структуры краіны былі сабраны на нейкай адзінай электроннай пляцоўцы.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **СУП «Гомельская СПМК-119» ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, Кореневское шоссе, 4а** |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование (назначение) | Адрес |
|---|---|---|
| 1 | **Склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) общей площадью 498,2 кв. м, инв. номер 350/С-78153. Составные части и принадлежности: кирпичный склад, панельный склад, панельная пристройка | г. Гомель, ш. Кореневское, 4Б/ 5 |
| | **Легкотипный навес** (сооружение специализированное складов, хранилищ) общей площадью 124,3 кв. м, инв. номер 350/С-115687 | г. Гомель, ш. Кореневское, 4Б/ 4 |
| | **Мастерские** (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) общей площадью 145,2 кв. м, инв. номер 350/С-78159. Составные части и принадлежности: одноэтажное панельное основное строение, кирпичная пристройка, двое ворот, калитка, 4 забора, покрытие бетонное, покрытие асфальтовое | г. Гомель, ш. Кореневское, 4Б/ 3 |
| | **Кабельные линии электроснабжения** (сооружение специализированное энергетики), инв. номер 350/С-86527. Составные части и принадлежности: подземные кабельные линии электроснабжения протяженностью 117,3 м от ТП № 547 до строения РМЦ | г. Гомель, ш. Кореневское, 4А |

В состав лота также входит: ограждение металлическое (инв. № 70127)

**Начальная цена (без НДС) – 121 684,76 бел. руб. (шаг аукциона – 6 084,24 бел. руб.)**

**Сведения о земельном участке:** предмет расположен на земельном участке площадью 0,9134 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации зданий и сооружений производственно-складского назначения.
После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя, в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением регистрационных действий в отношении земельных участков, необходимых для обслуживания предметов аукциона и произвести государственную регистрацию договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных продавцом. Расходы по оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона несутся покупателем

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Контактное лицо по осмотру: тел. +37529-670-83-18 (Громыко Юлия Ивановна), +37544-564-52-67 (Леонид Павлович Абакумов)

Лица, желающие принять участие в торгах обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 1 (одного) процента до 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона, в т. ч. о размере вознаграждения, размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 14.07.2020 г.

**Дата, время, место проведения аукциона: 12.10.2020 в 12.00,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Дата, время, место начала и окончания приема заявлений на участие в торгах: с 22.09.2020 в 15.00 по 08.10.2020 до 17.00,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Контактные телефоны: +375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **РУП «МИНСКЭНЕРГО», г. Минск, ул. Аранская, д. 24** |

**Предмет аукциона: недвижимое имущество, расположенное по адресу: Минская обл., Червенский р-н, Рованичский с/с, аг. Рованичи, ул. Озёрная, д. 10 – 2**

| Инв. номер | Наименование (назначение) | Общ. пл. | Составные части и принадлежности |
|---|---|---|---|
| **615/D-16408** | **Склад (складское помещение)** | **68,3 кв. м** | **Пристройка, сарай** (в соответствии с техническим паспортом) |

Земельный участок пл. 0,2440 га предоставлен на праве аренды по 01.09.2064. Доля: 1/2

Начальная цена: **1 (одна) базовая величина без НДС**

**Задаток в размере 1 (одной) базовой величины** перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. Срок внесения задатка: по 15.10.2020

**Дата и время проведения аукциона: 19.10.2020 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.

**Дата и время окончания приема документов: 15.10.2020** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by/ru/) 18.09.2020

**Контактные данные:** +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by



28.09.2020 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1) О проведении дополнительной эмиссии акций открытого акционерного общества «Гомельжилпроект».

2) О проведении закрытой подписки на акции дополнительной эмиссии.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 21.09.2020 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Дата сбора реестра акционеров – 21.09.2020 г.

УНП 400022625

Наблюдательный совет.